*Святлана Гуткоўская*

**ТАНЦАВАЛЬНЫ ФАЛЬКЛОР У СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ «ХАРЭАГРАФІЧНАЕ МАСТАЦТВА»**

Апора на нацыяльны фальклор з'яўляецца асновай прафесійнай падрыхтоўкі кадраў на кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Гэта тычыцца, перш за ўсе, да пытанняў выхавання будучых балетмайстраў. Зберажэнне багаццяў і традыцый народнай танцавальнай творчасці, арганічнае ўключэнне іх у сучасную харэаграфічную культуру – важная тэарэтычная і практычная задача, якая стаіць перад будучымі спецыялістамі-харэографамі, таму галоўным у дзейнасці кафедры з'яўляецца арыентацыя на нацыянальную спадчыну беларускага народа, што знайшло адлюстраванне
ў вучэбных праграмах спецыяльных дысцыплін.

На гэтым кірунку назапашаны значны вопыт, распрацаваны метадычныя асновы. Праблеме выкарыстання фальклору ў навучальным працэсе на спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва» прысвечаны шэраг даследаванняў, у якіх падаюцца: абгрунтаванне неабходнасці спецыяльнай падрыхтоўкі студэнта да работы з нацыянальным фальклорам [4]; змест паняццяў «харэаграфічны фальклор», «узор народнай танцавальнай творчасці», «варыятыўнасць», «кампазіцыя народнага танца», «пластычны матыў» [1]; прынцыпы класіфікацыі народнай харэаграфіі [5]; методыка збірання і фіксацыі фальклорных узораў; вызначэнне спосабаў сцэнічнай апрацоўкі фальклорных першакрыніц [2,4,5]; праграма ўзаемадзеяння спецдысцыплін па арыентацыі на мэтанакіраваную работу з фальклорам [ 3].

Метадычны пошук кафедры цесна звязаны с сучаснай сцэнічнай практыкай. Як справядліва адзначае Ю.Чурко: «Ахавальна-рэстаўратарскія адносіны да фальклора і яго традыцый павінны, як мінімум, спалучацца з актыўна- пераўтваральнымі. Захаванне традыцый – гэта не паўтарэнне іх, а развіццё. І калі вучыцца ў фальклора, то перш за ўсё дыялектыцы пераемнасці і наватарства, якія забяспечваюць пастаянны дынамізм яго форм, яго вечнае ўзнаўленне» [6, с.56 ].

Адзначым, што на кафедры харэаграфіі існуе сістэма падрыхтоўкі будучых спецыялістаў да работы з танцавальным фальклорам: ад працэсу збора фальклорнага матэрыялу да стварэння творчых праектаў (канцэртных праграм) і, такім чынам, уключэння фальклору ў сучасны творчы працэс.

На практыцы гэта выглядае наступным чынам. З 1981 па 1990 гады на кафедры дзейнічала Галіновая навукова-даследчая лабараторыя беларускай танцавальнай творчасці (ГНДЛ), працэс арганізацыі і станаўлення якой звязаны з імем вядомага фальклрыста, доктара мастацтвазнаўства, прафесара Ю.М.Чурко. Асноўнымі мэтамі лабараторыі з'яўлялася збіранне, навуковая сістэматызацыя і аналіз узораў беларускай народнай танцавальнай творчасці, стварэнне фальклорнага «банка» і харэаграфічнага атласа Беларусі, публікацыя навуковых прац, выданне фальклорных зборнікаў, і, галоўнае, – укараненне вынікаў даследаванняў у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне харэаграфічнага мастацтва і практычную дзейнасць кіраўнікоў танцавальных калектываў Беларусі.

Усяго было даследавана 766 вёсак з 104 раёнаў Беларусі. Сёняшні архіў ГНДЛ мае алфавітны, жанравы і тапаграфічны каталогі, фона-, нота-, фота-, слайда- і фільматэку, у якіх налічваецца звыш 17 адзінак захавання, змяшчае фонд літаратуры па харэаграфічным фальклоры, у якім асобным раздзелам з'яўляюцца выпіскі з прац фальклрыстаў і этнографаў ХІХ-ХХ стагоддзяў.

Найбольш важную ролю архіўныя матэрыялы ГНДЛ адыгрываюць у працэсе здзяйснення студэнтамі практычнай пастановачнай дзейнасці, паколькі праграма адной з вядучых спецыяльных дысцыплін – «Мастацтва балетмайстра», на якой яны атрымліваюць веды, засвойваюць прыемы і напрацоўваюць навыкі па сачыненню ўласных танцавальных твораў, складзена з улікам актыўнага выкарыстання фальклорнай спадчыны беларускага народа. Так, пры ўвасабленні творчых заданняў на першым і другім курсах у якасці зыходнага матэрыяла для вучэбнай эцюднай работы выкарыстоўваюцца канкрэтныя ўзоры народнай танцавальнай творчасці. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы «Малюнак танца як складаная частка і выразны сродак харэаграфічнай кампазіцыі» эцюды ствараюцца на аснове ўзораў карагоднага жанра, пры засваенні тэмы «Танцавальная лексіка як складаная частка і выразны сродак харэаграфічнай кампазіцыі»– на аснове полек і гарадскіх бытавых танцаў і г.д. Такім чынам, у ходзе вучэбнага працэсу студэнтам паступова прывіваюцца ўменні і навыкі работы з танцавальным фальклорам. Далей на гэтай жа аснове здзяйсняецца пастановачная работа па стварэнню завершаных харэаграфічных кампазіцый.

Выкладчыкамі кафедры ўжываецца спецыяльна распрацаваная методыка работы па стварэнню сцэнічных твораў на аснове народнай танцавальнай творчасці. Цэласны працэс творчай дзейнасці харэографа-пастаноўшчыка, звязаны з выкарыстаннем фальклора, згодна гэтай методыцы, падзяляецца на некалькі ўзаемазвязаных этапаў.

Да першага этапа адносіцца скрупулезнае вывучэнне матэрыялаў па нацыяльнаму фальклору, у тым ліку і ўскосных крыніц, з далейшым іх дэталевым аналізам у мэтах збора найбольш поўнай інфармацыі аб канкрэтных танцавальных узорах. У гэты перыяд неацэннае значэнне мае вывучэнне багатага і разнастайнага матэрыяла з архіва ГНДЛ кафедры. Паралельна ідзе пошук адпаведнага музычнага суправаджэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На другім этапе студэнт пластычна «ажыўляе» абраны імі за аснову танцавальны ўзор, які быў зафіксаваны ў фальклорнай экспедыцыі і, як правіла, занатаваны слоўна-графічным спосабам або (у лепшым выпадку) запісаны на кіна-, відэаплёнку. Дакладней, студэнт узнаўляе ў практычным выкананні запісы танцавальных рухаў, поз, малюнкаў і г.д. У выніку ствараецца наглядны пластычны вобраз, выяўляюцца асаблівасці выразных сродкаў пеўнага фальклорнага ўзора.

На наступным этапе харэограф вылучае асноўны пластычны матыў, танцавальны малюнак, кампазіцыйны фрагмент альбо яркі харэаграфічны вобраз і развівае іх, актыўна выкарыстоўваючы розныя мастацкія сродкі і прыемы.

Завяршальным этапам работы пастаноўшчыка з'яўляецца практычнае ўвасабленне задумы будучай танцавальнай кампазіцыі, якая сфарміравалася ў выніку праходжання папярэдніх этапаў.

У залежнасці ад колькасці першапачатковай інфармацыі, якую ўдалося сабраць, студэнт выбірае адзін са спосабаў інтэпрэтацыі ўзораў фальклора: *выкананне аўтэнтычнага ўзора*, прыстасаванага да сцэнічнай прасторы; *мастацкую апрацоўку фальклорнага ўзора*, якая прадугледжвае яго змяненне і развіцце з мэтай рашэння пэўных мастацкіх задач; творчую распрацоўку першакрыніцы, г.з. стварэнне харэаграфічнага твора па матывах фальклорнага ўзора; *стварэнне арыгінальнага аўтарскага твора* без прамога цытавання фальклорнага ўзора [4, с.13-14]. Мастацкая апрацоўка ўзораў народнай харэаграфіі мае ў канчатковым выніку адзіную мэту – даць «другое жыццё» нацыянальнаму танцавальнаму фальклору на сцэнічных пляцоўках, не толькі адраджаючы народныя танцы ва ўсім багацці форм, жанраў і выразных сродкаў, але і развіваючы фальклорныя традыцыі з улікам новага светаўспрымання і эстэтычных установак.

Пасля засваення спосабаў і прыемаў сачынення завершанага харэаграфічнага твора студэнты пераходзяць да выканання больш складанага задання. На трэцім курсе яны ствараюць буйную форму – тэатралізаванае прадстаўленне, так званую фальклорную вечарыну. Правядзенне штогод на кафедры харэаграфіі БДУ культуры і мастацтваў фальклорных вечарын з'ўляецца традыцыйным. Гэта канцэртная форма, у якой асобныя, створаныя студэнтамі на аснове сабраных фальклорных матэрыялаў, танцавальныя нумары аб'ядноўваюцца ў адзіную праграму. Адна з такіх фальклорных канцэртных праграм была паказана ў 1986 годзе на Міжнародным сімпозіуме па пытаннях харэаграфічнага фальклору, праведзенага пад эгідай ЮНЕСКА ў Ноўгарадзе, і атрымала высокую ацэнку спецыялістаў. У апошнія гады студэнтамі кафедры былі паказаны наступныя праграмы: «Танчым па-даўнейшаму» , «Будзе жыта, будзем сыты», «Паміж мінулым
і будучым», «Вяртанне да саміх сябе», «Кветка-ружа», «Каму пашанцуе, той і станцуе».

Такім чынам, дзякуючы прадуманай і добра арганізаванай сістэме навучання студэнты спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва» маюць магчымасць самастойна прайсці ўсе стадыі навукова-творчай работы з фальклорным матэрыялам – ад яго збора і запісу да стварэння на яго аснове твораў сцэнічнага мастацтва.

Асобныя пытанні на гэтым шляху кафедрай яшчэ не вырашаны, але, безумоўна, што нацыянальны фальклор арганічна ўключаны у працэс навучання будучых харэографаў, і гэта дае пленныя вынікі. Многія з балетмайстарскіх работ студэнтаў увайшлі ў рэпертуар аматарскіх і нават прафесійных калектываў нашай краіны.

**Спіс літаратуры:**

1. Беляева, О.П. Работа балетмейстера по созданию сценической композиции на основе белорусского хореографического фольклора / О.П. Беляева // Культура: открытый формат-2011 : сб. науч. работ ; ред. совет : Можейко М.А. (научн. ред.). – Минск : БГУКИ, 2011. – С. 13-16.
2. Гуткоўская, С.В. Гарадскія бытавыя танцы / С.В. Гуткоўская : вучэб.-метад. дапам. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2008. – 140 с.
3. Гутковская, С.В., Каминский, М.В. Выкарыстанне «метаду праектаў» пры рабоце над мастацкай апрацоўкай фальклору / С.В. Гутковская, М.В. Каминский // Аўтэнтычны фальклор : праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзельнікаў V міжнар. навук. канф. (Мінск, 29 красавіка – 1 мая 2011 г.) / БДУКМ ; рэдкал. : Мажэйка М.А. (адк. рэд.) і [інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2011. – С. 116–119.
4. Гуткоўская, С.В., Хадзінская, Н.М. Стварэнне сцэнічнай кампазіцыі на аснове харэаграфічнага і музычнага фальклору / С.В. Гуткоўская, Н.М. Хадзінская : вучэб. дапам. – Мінск : Бел.ун-т культуры, 2000. – 56 с.
5. Чурко, Ю.М. Белорусский хореографический фольклор / Ю.М. Чурко. – Мінск : Выш. школа, 1990. – 415 с.
6. Чурко, Ю.М. Белорусский танцевальный фольклор / Ю. Чурко // Pro танец : сб. статей. – Минск : Четыре четверти, 2011. – С. 9–61.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ